# РЭФЕРАТ

Справаздача 145 с., 1 кн., 147 крын.

ЛІНГВАКУЛЬТУРАЛОГІЯ, ЛІНГВАПРАГМАТЫКА, ЛІТАРАТУРНАЯ (ПАЭТЫЧНАЯ) АНАМАСТЫКА, ІМЯ ЎЛАСНАЕ, ПРАГМАТЫЧНАЯ ЗОНА СЕМАНТЫКІ ОНІМА, МОЎНАЯ КАРЦІНА СВЕТУ, АНАМАСТЫЧНАЯ КАНАТАЦЫЯ, ПАЭТОНІМ

Аб'ектам даследавання з'яўляецца паэтанімікон гістарычнай, аўтабіяграфічнай прозы, навукова-папулярных твораў, аўтарскіх казак і драматургіі Брэстчыны, выяўлены шляхам суцэльнай выбаркі з твораў брэсцкіх аўтараў. Канцэпцыя ўзаемасувязі ўласных імёнаў і нацыянальнай культуры выкарыстоўваецца ў працы як асноватворная пры разглядзе зместу і формы паэтонімаў.

Мэта працы – выяўленне нацыянальна-культурнай спецыфікі анамастыкону як фрагмента рэгіянальнай моўнай карціны свету Брэсцка-Пінскага Палесся на аснове комплекснага онамапаэтычнага і лінгвакультуралагічнага апісання анамастычнай прасторы мастацкіх твораў брэсцкіх пісьменнікаў XIX–XXI стст. У аснове праведзенага даследавання ляжаць наступныя метады: апісальны, супастаўляльны, метад класіфікацыі, прыёмы колькаснага падліку. Пры вывучэнні анамастычнага матэрыялу выкарыстоўваўся кантэкстуальны лінгвапрагматычны аналіз, які прадугледжвае ўлік не толькі жанравастылістычных параметраў тэксту, але і шырокага лінгвакультуралагічнага кантэксту.

Навуковая навізна даследавання ў тым, што ўпершыню праведзены аналіз аб'ёмнага ў змястоўным і храналагічным плане пласта літаратуры сучасных брэсцкіх аўтараў з арыентацыяй на нацыянальна-культурны патэнцыял анамастычных сродкаў. Разгледжаны структурныя асаблівасці і асноўныя крытэрыі выбару імя персанажа і "фонавага" оніма ў залежнасці ад сэнсавага аб'ёму намінацыі і нацыянальна-культурнага зместу. Крыніцай даследавання анамастыкону Брэсцка-Пінскага Палесся з'яўляюцца мастацкія творы, якія раней не вывучаліся лінгвістамі. У працы таксама разглядаецца праблема ўключэння онімаў як моўных адзінак з нацыянальна-культурным кампанентам значэння ў вывучэнне беларускай мовы ў ВНУ.

Вынікі працы прайшлі ўкараненне ў вучэбны працэс на філалагічным факультэце Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна і выкарыстоўваюцца пры чытанні лекцый і правядзенні практычных заняткаў па курсах "Анамастыкон мастацкага тэксту", "Беларуская анамастыка", "Сучасная беларуская мова". Вынікі даследавання выкарыстаны ў 11 канкрэтных распрацоўках (маюцца адпаведныя акты ўкаранення). Матэрыял і вынікі працы могуць знайсці практычнае выкарыстанне ў выкладанні лінгвістычных дысцыплін (сучаснай беларускай мовы, анамастыкі, філалагічнага аналізу тэксту, лігвакультуралогіі) у ВНУ і ў выкладанні беларускай мовы і літаратуры ў сярэдняй школе.